УДК 811.161.3’42

# ЧУЖАЯ МОВА ЯК КАМПАНЕНТ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

***Я.Ю. Нікіценка*** (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***А.М. Шубадзёрава***,
канд. філал. навук, дацэнт

У вусных і пісьмовых зносінах часта даводзіцца спасылацца на чужое выказванне. Чужое маўленне звычайна перадаецца ў выглядзе простай, ускоснай, няўласна-простай мовы, а таксама пры дапамозе сінкрэтычных форм.

У мастацкім тэксце найбольш часта выкарыстоўваецца простая і ўскосная мова. Ужыванне гэтых відаў чужога маўлення залежыць ад таго, наколькі поўна аўтар імкнецца перадаць выказванне героя літаратурнага твора. Пры выкарыстанні *ўскоснай мовы* ўвага засяроджана толькі на змесце таго, пра што вядзецца аповед. Лексічныя, граматычныя і стылістычныя асаблівасці чужога маўлення страчваюцца. Калі ёсць неабходнасць перадаць чужое выказванне даслоўна, аўтар выкарыстоўвае *простую мову*, бо яна не толькі дакладна перадае змест і форму чужога маўлення, але і дазваляе ахарактарызаваць персанажа як асобу.

Значна радзей у параўнанні з простай і ўскоснай мовай у мастацкім тэксце сустракаецца няўласна-простая і ўскосна-простая (паўпростая) мова. Кожны з гэтых відаў чужаслоўя мае свае адметнасці. *Няўласна-простая мова* – чужое маўленне, якое ўводзіцца ў аўтарскае паведамленне без спецыяльнага выдзялення ў тэксце, з захаваннем лексічных і граматычных асаблівасцей чужога выказвання, што дае магчымасць перадаць эмацыянальнасць і непасрэднасць настрою і думак персанажаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Чужое выказванне, у якім захоўваюцца граматычныя і лсксічныя асаблівасці простай мовы і якое пры гэтым афармляецца ў выглядзе складаназалежнага сказа, як ускосная мова, называецца *ўскосна-простай мовай, або паўпростай* [1, с. 248]. Канструкцыі з паўпростай мовай набываюць гутарковы характар. Нярэдка аўтар ускосна-простую мову заключае ў двукоссе, адмяжоўваючы такім чынам яе ад сваёй. Такая форма чужога маўлення выкарыстоўваецца, каб адлюстраваць непасрэдна сказанае.

Вывучэнне розных форм перадачы чужога выказвання – актуальнае пытанне ў сучасным мовазнаўстве, бо чужаслоўе дазваляе не толькі перадаць змест думак персанажа, але і захоўвае вобразнасць, яркасць, эмацыянальнасць і выразнасць мастацкага тэксту.

**Літаратура**

1. **Яўневіч, М. С.** Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова